# [На сьмерць „Узвышша“]

Калі я пачынаю думаць, што азначае факт, аб якім паве[даміў] „ЛіМ“, дык першае, што я адчуваю, гэта пустэчу. От зусім неяк анічога ня вяжацца з гэтым фактам. Ну ўсё роўна што гэта і ня факт, а толькі ягоная відомасьць. *І сапраўды*, уміраць можа жывое. *А якая можа быць сьмерць у мёртвага? А тое–ж аб чым „ЛіМ“ пав[едаміў], што яно дабрахоць памерла, бо прызнала, што няма чаго жыць яму на сьвеце белым? Яно хіба жывым было? Даўно ўжо мярцьвяком.* Мёртваму не дано пазнаць гэтага шчасьця ці няшчасьця ў сьвеце. І *таму* адчуваецца, што як–бы нічога і ня здарылася. Сапраўды, хіба гэта чым–небудзь на літар[атуры] адаб'ецца? Уважаю, што нічога ні дадатнага, ні адмоўнага гэты факт сабою не становіць. Гэта толькі „благарастварэньне воздухаў“. *„Узвы[шша]“ не памерла. Яго жывым пахавалі. „Узв[ышша]“ на ўздальлі. Яно пахована ў 1930 г., каб прыняць крыт[ыку] і сьмерць за бел[арускую] літ[аратуру]. Як яно ўскрэсьне…* Каб жыць, трэба сьмець дзярзаць, *трэба мець самом[у] свае мысьлі.* Каб жыць, трэба мець волю жыць. *А калі яе няма…*

*Каб вызначыць значэньне сьмерці „Узвышша“ трэба ведаць, чым „Узвы[шша] было пера[д сваім канцом].*

Пер[ш] таго, „Узв[ышша]“ перад сваі[м] канц[ом]:

а) жыв[ы] мяртвец ці мёртвы жывец;

б) у літ[аратурным] руху гэта пазаднік, падбіральнік крохаў, пад[аючых] са стал[а] хаджаіна;

в) компрометатар „Узв[ышша]“ да 1930 г. — гэта сапажырацель, гэта тыя чужыя рукі, якімі заграбалі жар хаджаіны, гэта сьляпая зброя ў руках адмаўленцаў „Узвыш[ша]“ як літ[аратурнай] школы ў бел[арускай] літ[аратуры];

г) гэта аматары самааплёўваньня, і самабічаваньня, і самарасьпінаньня.

Сьмер[ць] яго — гэта сьмерць літарат[урнага] пасьмешышча. Яны добра зрабілі, што памерлі. *Бо* [нрзб.] *так жыць, як яны жылі, такую ролю адыгрываць, як яны адыгрывалі, [падобна] жывой сьмерці.* Сён[ьняшняя] сьмер[ць] — гэта пасьмертн[ае] выданьне, фактычн[ая] сьм[ерць] — 1930 г., гэта запозьнен[ае] сьцьвердж[аньне] факта, што „Узв[ышша]“ памерла ў 1930 г. не само, а будучы задушаным бандытамі, наладзіўшым[і] пагром па бел[арускай] культ[уры].

*[Сакавік — красавік 1932]*